# Выстаўкі ў бібліятэках

У бібліятэках сталіцы адкрыты выстаўкі, прысвечаныя творчаму шляху палымянага рускага пісьменніка-патрыёта Н. А. Некрасава. Выстаўкі выклікалі вялікую цікавасць чытача да класічнай спадчыны паэта.

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна выстаўка, прысвечаная Н. А. Некрасаву, знаходзіцца ў агульнай чытальнай зале.

Чытачы падоўгу спыняюцца каля яе, з цікавасцю знаёмяцца з разнастайнымі выданнямі кніг паэта.

Цікавасць уяўляе раздзел выстаўкі «Некрасаў — журналіст і выдаўца». Тут можна ўбачыць літаратурны часопіс «Современник», якім з 1847 г. кіраваў Н. А. Некрасаў. У трэцім томе «Современника» за 1847 г. змешчаны вершы паэта «Филантроп», «Внимая ужасам войны» і «Саша».

Далей бачым некрасаўскія «Отечественные записки», якія працягвалі ў новай абстаноўцы развіваць ідэі «Современника».

На асобнай вітрыне — творы В. І. Леніна, у якіх ён пісаў аб Некрасаве, а таксама кнігі М. І. Калініна, даклад А. Жданава «Аб часопісах «Звезда» і «Ленинград». Тут-жа змешчаны асноўныя творы паэта: аднатомнікі, зборы твораў, што выдаваліся ў савецкі час.

Раздзел выстаўкі «Рэвалюцыйныя дэмакраты аб Некрасаве знаёміць чытача з творамі Белінскага, Дабралюбава, Чэрнышэўскага, у якіх яны пісалі аб палымяным патрыёце зямлі рускай.

Раздзелы выстаўкі «Некрасаў у рускай крытыцы», «Жыццё і творчасць Некрасава», «Некрасаў — дзецям» паказваюць, якая вялікая спадчына паэта, як многа ён зрабіў для свайго народа. Кнігі Луначарскага, Чукоўскага, Еголіна, Еўгеньева-Максімава расказваюць аб жыццёвым і творчым шляху паэта.

Творы Н. А. Некрасава ў савецкі час заваявалі шырокую любоў і прызнанне чытача.

Яны былі выдадзены на 37 мовах народаў Саюза ССР тыражом 15 мільёнаў 600 тысяч экзэмпляраў.